


## У НУМАРЫ


| ***Навіны*** | ***Навуковая праца*** |
|---|---|
| **Кніга водгукаў** | **Заслаўе ў беларускай культуры** |
| **На лёгкіх хвалях акварэлі або выстава работ Марыі Сыракваш** | **Покровитель защитников Отечества — икона “Иоанн Воин”** |
| **Наша выстава ў Мінску** | |
| **Успаміны і персаналіі** | |


## ***Навіны***

### Кніга водгукаў

**2014**

“Спасибо организаторам выставки за возможность оказаться в пасмурный февральский день среди картин Лебедевой М., от которых исходит тепло и свет. Заславль просто сказочный, очень красиво, и чувствуешь себя, глядя на пейзажи, как бы вне времени. Желаю автору, моей любимой сестре, творить и радовать своих почитателей светлой и радостной живописью” (Н. Заваротная, 8 лютага).

“Огромное спасибо сотрудникам музея за познавательную экскурсию и главное доступную для учащихся 3 класса. Спасибо” (СШ №154, г. Мінск, 28 лютага).

“Наша вялікая ўдзячнасць гэтаму музею і асабіста экскурсаводу Аляксею [Лябёдкін]. Яго бадзёры, апантаны аповед захапіў нас і пакінуў незабыўны след у сэрцах. Вельмі пазнавальна і патрыятычна. Дзякуем шчыра!” (вандроўнікі з Мінска, 23 сакавіка).

“Огромная благодарность музею за столь чудесную коллекцию и демонстрацию быта Белоруссии. Помимо всего прочего, мы выражаем

огромную благодарность чудеснейшим экскурсоводам, подобным Тамаре Андреевне [Гудына]. Большое вам спасибо!” (Муніцыпальная бюджэтная агульнаадукацыйная ўстанова “Сярэдняя агульнаадукацыйная школа №56 ім. Героя Савецкага Саюза І.П. Пацехіна”, г. Тула, Расійская Федэрацыя, 27 сакавіка).

“Мне понравилось всё, но больше всего картина “Канут Русецкі” с лошадью… Всё было очень красиво!” (вучань СШ №73 г. Мінска, 12 красавіка).



*Кніга водгукаў музея-запаведніка,*
*якая захоўваецца ў музейна-выставачным комплексе*

“Мы, отдыхающие санатория “Приозёрный”, Крюков А.В. и Афанасьев А.М. посетили выставку и музей музыкальных инструментов. Выражаем огромную благодарность сотрудникам музея. Мы восхищены тем, как у вас сохраняется история…” (18 красавіка).

“Спасибо большое за экскурсию!!!” (маёр в/ч 52859, г. Караганда, Казахстан, красавік).

“Спасибо. Очень интересно, особенно гобелены. Экскурсовод интересно рассказал” (госць з г. Масква, Расійская Федэрацыя, 2 мая).

“Спасибо огромное за проведение экскурсии. Мы узнали много нового и повторили то, что забыли. Спасибо огромное!” (гімназія г. Шчучын, 6 “в” клас, 23 мая).

“Вельмі цікава было пабачыць выставу, прысвечаную Заходняй Беларусі ў міжваенны час! Цікава!” (Анатоль Тарас, рэдактар гістарычнага альманаха “Дзяды”, 12 верасня).

“Коллектив педагогов, учащихся и родителей специальной школы №18 г. Минска для детей с тяжёлыми нарушениями речи выражает глубокую благодарность экскурсоводу Алексею Александровичу [Лябёдкін] за высокий профессионализм, увлечённость своим делом, умение заинтересовать слушателя, доброжелательное отношение к посетителям” (30 лістапада).

“Учащиеся СШ №26 г. Минска благодарят Тамару Андреевну [Гудына] за интересный, содержательный, познавательный, увлекательный рассказ о мельнице, а также в музее. Благодаря ей, мы узнали много нового, что пригодится нам в дальнейшей учёбе” (15 лістапада).

**На лёгкіх хвалях акварэлі або выстава работ Марыі Сыракваш**

Часта мы не заўважаем простай прыгажосці вакол нас. Незвычайны сваім выглядам дом, бераг возера, старажытны храм… Ці мала цікавых рэчаў мы сустракаем штодня і пакідаем іх па-за ўвагай, бо мы спяшаемся, бо мы ў клопатах: абавязках, дэдлайнах і іншых межах, якія аддаляюць ад нас прыгажосць.



*Музейна-выставачны комплекс, агульны абрыс часткі выставы*

*Як жа заўважыць яе? Крыху суцішыцца і прыпыніцца, агледзець наваколле – і пабачыць яго. А хто паможа чалавеку ў пошуках штодзённай прыгажосці і дзе яе можна знайсці? Вядома, дапаможа ў*

*гэтым мастак, які на карцінах сваіх адлюстраваў гэта простае і сапраўднае. Дзе? Чаму б не ў музеі, дзе можна не паспяшаць і заставацца сам-насам са сваімі думкамі, творамі, успамінамі?*



*Слабодка, акварэль, 2020 г. Работа Марыі Сыраквааш*



*Цішыня, акварэль, 2020 г. Работа Марыі Сыракваш*

Запрашаем Вас на выставу цудоўнай акварэлі мастачкі Марыі Сыракваш пад назвай “Вандроўкі” (“Vandroūki”), якая дзейнічае ў музейна-выставачным комплексе музея-запаведніка (г. Заслаўе, вул. Рынкавая, 4) з 2 да 28 лютага. Фарбы, возера, лёгкія хвалі акварэлі…Хіба гэтага мала, каб душою адпачыць?!

## Успаміны і персаналіі

*Працягваем друк успамінаў Аляксандра Калбаскі (пачатак у №9). Дадаткова адзначаем, што матэрыял, адлюстраваны ва ўспамінах, цэласна сфармаваўся ў 1999-2000 гг., таму не ўсе закранутыя ў ім аспекты могуць цалкам адпавядаць сённяшняму бачанню спецыялістаў музейнай справы, як і не ўсе прыведзеныя ў тэксце назвы ўстановаў адпавядаюць сучасным. Матэрыял друкуецца фактычна без зменаў (або з мінімальнымі), апрача, галоўным чынам, захадаў скарачэння аб'ёму [Рэд.].*

### ***Як пачыналася***

### МУЗЕЙНЫ НАВІГАТАР,

### ЦІ ПАРАДЫ МУЗЕЙНАГА ДЫРЭКТАРА

**Якія музейныя адносіны ў дачыненні да навучання і прафесійнага росту?**

Ці адбываюцца ў музеі ўласныя навучальныя сесіі, азнаямляльныя візіты ў іншыя музеі ці калектыўныя абмеркаванні мэт і задач іх дзейнасці?

Як музей выпрацоўваў план, якая сістэма ацэнкі зробленага? Як становіцца вядома пра поспехі ці правалы?

Ці зарэгістраваны музей?

Ці мае музей бягучы план**,** бізнес-план, план перспектыўных дзеянняў, праграму падрыхтоўкі і удасканалення?

**Кіраванне**

Як музей быў заснаваны? Каму падпарадкоўваецца? Хто яго папячыцелі, кансультанты? Які уплыў на палітыку музея кіруючае кола робіць ці павінна рабіць?

Што адбываецца ў дадзены момант у іх спецыфічным сектары палітычнай эканомікі? Узаемадносіны з фундатарамі, нацыянальным урадам, мясцоваю уладаю? Які эфект гэта дае?

**Калекцыі**

Што музей збірае? Чаму збірае? Калі пачалі ствараць калекцыі? Як супрацоўнікі вырашаюць, што збіраць? Наколькі асэнсавана (прыходзіцца дарэчы) збіральніцкая дзейнасць музея? Наколькі раўнамерна і карысна выкарыстоўваецца сабранае? Ці ведаюць яны, што збіраць потым?

Ці відавочна натхненне, наватарства, свядомасць ў іх калекцыянаванні? Як вы ацэніце іх калекцыі?

Ці праводзіць калектыў экспедыцыі, даследаванні, пошук? Калі не, то чаму? Як удасканальваюць свой адукацыйны і прафесійны узровень?

Як калекцыі размешчаны і арганізаваны? Колькі прадметаў каталагізавана? Калі не шмат – чаму так здарылася і як збіраюцца гэта вырашаць?

Якою сістэмаю дакументацыі карыстаюцца? У чым яе заслугі і недахопы? Ці выкарыстоўваюць камп'ютары? Якая якасць запісаў не заведзеных у камп'ютар?

На што падобны выгоды ў сховішчах? Ці забяспечваюць яны адэкватную ахову калекцый? Як сховішчы спалучаюцца з экспазіцыйнымі і кансервацыйнымі плошчамі? Якая працэдура дастаўкі музейных прадметаў?

Як музей забяспечвае бягучыя патрэбы сваіх калекцый? Ці ёсць умовы для кансервацыі? Якая палітыка музея ў дачыненні да кансервацыі?

Ці ёсць умовы для працы даследчыкаў-візіцёраў? Ці існуе бібліятэка? Ці добрая яна?

**Публічная тэрыторыя**

Якое ўражанне ўтварае прастора для наведвальнікаў? Ці клапоціцца музей пра сваіх наведвальнікаў? Ці думае пра інтэлектуальныя, адукацыйныя, фізічныя і грамадскія патрэбы сваіх наведвальнікаў?

Як цяжка было б эвакуіраваць музей, калі б такая патрэба ўзнікла? Ахоўваецца музей спецаховаю ці электронікаю? Што яны будуць рабіць у выпадку пажара ці крадзяжу? Ці маглі б яны адказаць на пытанні адносна калекцый і экспазіцый?




*Аляксандр Калбаска.*
*Прэзентацыя кнігі “Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Заслаўя”, 2000 г.*

**<u>Выстаўкі і экспазіцыі</u>**

Якія ў музея асноўныя выстаўкі і экспазіцыі? Чаму былі абраны гэтыя тэмы? Ці адпавядае змест экспазіцыі тэме, дэкларараванай у загалоўку?

Пра што расказваюць гэтыя экспазіцыі? З'яуляюцца яны нацыянальнымі ці інтэрнацыянальнымі?

Што ўключана, а што выключана з іх? Ці падаецца прадстаўленне лагічным і збалансаваным?

Ці сустракалася такое раней, альбо гэта новы падыход?

Наколькі дапамагаюць анатацыі? Для каго яны напісаны? Ці адказваюць яны на вашыя пытанні? Ці дапамагаюць яны бачыць выстаўленае? Наколькі яны вялікія (доўгія)? Ці добра яны складзеныя? Той, хто пісаў, гаворыць да цябе, ці размаўляе сам з сабою? Ці патрэбны спецыяльныя лінзы, каб прачытаць тэкст? Ці маюцца дадатковыя сродкі

прадстаўлення, такія як аўдыё-візуальныя тэрыторыі, аўдыёгіды, друкаваныя пуцевадзіцелі і г.д.?

Якога ўзросту экспазіцыі? Наколькі яны бяспечныя? Ці маглі б вы адкрыць вітрыну?

Як забяспечаны кантроль за асвятленнем, тэмператураю і вільгаццю на экспазіцыйнай тэрыторыі? Ці дастаткова гэтага? Ці не патрабуюць прадметы дадатковага клопату? Ці атрымліваюць яны яго?

Ці ёсць умовы для часовага экспанавання? Ці існуе праграма часовых выстаў? Як яна прадстаўляецца?

Ці клапоцяцца выстаўкі і экспазіцыі, працуючыя ў музеі, пра розныя катэгорыі наведвальнікаў? Ці атрымаў бы ты задавальненне ад экспазіцыі ва ўзросце шасці гадоў, будучы глухім ці васьмідзесяцігадовым, альбо ў суправаджэнні шаснаццацігадовага брата-блізнюка?

Адкуль музей даведваецца, што яго экспазіцыі і выстаўкі працуюць? Ці клапоціцца ен пра тую ці іншую форму ацэнкі? Ці задавальняецца толькі колькасцю наведвальнікаў? Ці ўпэўнены, што колькасць магла б быць падвоена ў выпадку іншых выстаў і экспазіцый?

Хто прыходзіць у музей? Чаму? Хто не прыходзіць у музей? Чаму?

**<u>Адукацыя</u>**

Ці ёсць у музеі адукацыйная служба? Ці стала гэта зразумелым яшчэ на ўваходзе? Якую ролю адыгрывае адукацыйны калектыў у музеі? Якую падтрымку атрымлівае?

Што яны робяць для дзяцей дашкольнага ўзросту, пачатковай і сярэдняй школы? Ці мае музей клуб для пазашкольнай дзейнасці? Ці ёсць адукацыйныя праграмы для дарослых? У якой форме? Працуе музей толькі са старэйшымі прадстаўнікамі дадзенай мясцовасці ці і на іншых тэрыторыях?

Ці ёсць памяшканне для адукацыйных заняткаў? Ці добра абсталявана? Ці існуе лекцыйная зала? Як часта выкарыстоўваецца?

Ці выступае музей пасярэднікам паміж настаўнікамі і мясцовымі адукацыйнымі кіраўнікамі? Ці праводзіць семінары для настаўнікаў? Ці маецца пастаянная сувязь з работаю мясцовых педагагічных семінараў?

Як адслежваецца і ацэньваецца педагагічнае забеспячэнне музейнай актыўнасці?

**<u>Абслугоўванне наведвальніка</u>**

Ці ўхваляе музей запыты і даведкі? Колькі прыходзіцца іх даваць на тыдзень? Ці спраўляецца з гэтым?

Што музеем надрукавана? Ці маюцца паштоўкі з выявай калекцыйных прадметаў у продажы?

Ці камфортнае гэта месца для знаходжання? Ці можаш ты кіраваць сваім часам, выбіраць, што ты хочаш убачыць, мець магчымасць прысесці, калі спатрэбіцца? Ці можаш ты перарваць свой візіт дзеля кубачка гарбаты?

Ці хочацца табе быць тут? Хацеў бы вярнуцца? Прывесці сяброў? Прывесці некага, хто ніколі не ходзіць у музей *[працяг будзе – Рэд.]*.

*Аляксандр Калбаска, прафесар ЕГУ,*
*дырэктар Запаведніка ў 1988-1994 і 1997-2000 гадах,*
*aliaksandr.kalbaska@ehu.lt*

## Наша выстава ў Мінску

Вядома, што музей-запаведнік на працягу гадоў вядзе актыўную дзейнасць па арганізацыі выстаў. Арганізуюцца яны не толькі на сваіх плошчах, але і на плошчах іншых устаноў (выязныя), па загадзя вызначанай дамоўленасці. Што тычыцца выстаў на плошчах іншых устаноў, то ў іх музей-запаведнік выступае як асноўным прадстаўляльнікам матэрыялаў, так і ўдзельнікам па прадстаўленні пэўных прадметаў у асобныя тэматычныя часткі выстаў.

Як у першым, так і ў другім выпадку выкарыстоўваюцца арыгінальныя матэрыялы з фондаў музея-запаведніка. Асноўную працу ў гэтым накірунку выконваюць супрацоўнікі аддзела фондаў і непасрэдна галоўны

захавальнік. Сапраўднымі спецыялістамі ў гэтай галіне з'яўляюцца Аляксандр Канстанцінавіч Рак – галоўны захавальнік і Ірына Дзмітрыеўна Арцем'ева – старшая навуковая супрацоўніца аддзела фондаў музея-запаведніка.



*Хатні керамічны посуд з фондаў ГКМЗ “Заслаўе” рыхтуецца да выставы*

Можна згадаць шмат выязных выстаў, якія адбываліся цягам гадоў альбо бліжніх месяцаў, але звернемся непасрэдна да актуальнага, цяперашняга моманта. Зараз выстава “Чароўныя мелодыі гліны” з прадметамі з нашых фондаў экспануецца ў Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры ў Мінску. У складзе выставы арыгінальны керамічны посуд з розных рэгіёнаў Беларусі, сабраны нашымі супрацоўнікамі ў этнаграфічных экспедыцыях, керамічныя цацкі, сувенірная прадукцыя з керамікі. Галоўным чынам – гэта паліваная або глазураваная кераміка. Выстава дзейнічае з 7 лютага да 13 сакавіка. Не прамініце наведаць, каб роднае ведаць! Ганчарства – старадаўняя традыцыя продкаў, якая заслугоўвае ўвагі і захавання.

Навіну аб згаданай вышэй выставе Вы можаце пабачыць на афіцыйнай старонцы радыё “Сталіца” ў інтэрнэце, скарыстаўшыся з наступнай спасылкі: https://radiostalica.by/news/posudu-iz-raznykh-vidov-keramiki-i-stilizovannye-glinyanye-igrushki-predstavili-na-vystavke-v-minske/, а

таксама ў газеце “Прысталічча” (№6 за 9 лютага 2022 г. – “Из Заславля с любовью к истории”, с. 4).

***<u>Навуковая праца</u>***

**Заслаўе ў беларускай культуры**

У музейным асяродку Беларусі даволі вядомай і значнай установай з'яўляецца Мінскі абласны краязнаўчы музей (далей – МАКМ), што знаходзіцца ў г. Маладзечна. Вядомы ён выдатна падрыхтаванымі экспазіцыямі, прафесійным складам супрацоўнікаў, багаццем і арыгінальнасцю сваіх фондаў. Але чым ён цікавы менавіта для Заслаўя? Дзе можна прасачыць сувязь, кропкі судакранання і прыцягнення? Адной з такіх кропак з'яўляецца габелен, змешчаны ў МАКМ, габелен, які зноўку нагадвае аб высокай каштоўнасці Заслаўя як для культуры і гісторыі Мінскай вобласці, так і для культуры і гісторыі Беларусі ўвогуле.




*Фрагмент габелена “Старажытнейшыя гарады Мінскай вобласці” ў Мінскім абласным краязнаўчым музеі (Маладзечна)*

Гэта габелен “Старажытнейшыя гарады Беларусі” аўтарства мастака Эдуарда Рымаровіча (1957-2013). Створаны ён у 2008 г.; складаецца з сямі частак, агульнай плошчай у 25 кв.м. Цэнтральная частка ўяўляе Мінскую вобласць агулам і г. Маладзечна, астатнія шэсць – гарады Мінскай вобласці: Слуцк, Лагойск, Заслаўе, Клецк, Нясвіж, Барысаў. На кожнай

частцы прысутнічае герб горада (на цэнтральнай частцы, прысвечанай Мінскай вобласці – герб вобласці, герб Маладзечна), а таксама адзін абраны помнік архітэктуры, які мае рэпрэзентаваць горад, служыць адлюстраваннем адметнасці. Заўважна адрозніваюцца сваім зместам часткі габелена, прысвечаныя Заслаўю і Клецку, бо на іх, апрача гербаў, размешчаны яшчэ і выявы гістарычных асоб: у першым выпадку – Рагнеда і Ізяслаў, у другім – Сымон Будны. Цікава, што Будны жыў і працаваў не толькі ў Клецку, але і ў Заслаўі, што нібыта пэўным чынам праз яго асобу радніць гарады між сабою. Цэнтральная частка таксама мае сваю адметнасць – на ёй выяўлены анёлы.

Цяпер асобна звернемся да апісання той часткі габелена, якая непасрэдна прысвечана Заслаўю. Уверсе яе бачым залацістага колеру стужку з надпісам “Заслаўе”, пад якою змешчаны сучасны герб горада. У правай ніжняй частцы – выявы заснавальнікаў: Рагнеды і Ізяслава. Рагнеда правай рукой сімвалічна “паказвае на храм”, які побач, Ізяслаў сімвалічна трымае ў руках маленькую царкву. Храм, на які паказвае Рагнеда, гэта сучасны Заслаўскі Спаса-Праабражэнскі Сабор – другая кафедра Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага і архітэктурная “візітоўка” Заслаўя або найбольш каштоўны і пазнавальны помнік мураванага дойлідства горада, каштоўнасць рэспубліканскага значэння.

Той, хто шукае, заўжды знаходзіць. Вось і мы пашукалі ды натрапілі на чарговы “след” Заслаўя ў беларускай гісторыі і культуры. Калі Вы натрапіце на падобнага кшталту “сляды”, вандруючы па Беларусі або за яе межамі, пішыце, калі ласка, і дасылайце выявы гэтых “слядоў” нам на пошту: excurs_zaslaue@mail.ru. Будзем Вам шчыра ўдзячныя!

### Покровитель защитников Отечества — икона “Иоанн Воин”

В феврале мы отмечаем праздник мужчин, но не просто мужчин, а мужчин-защитников, мужчин-воинов. Поэтому именно в феврале уместно рассказать об этом экспонате коллекции “Живопись” нашего музея-заповедника, а именно о редкой иконе конца XIX века, которая была приобретена в 1995 году. Немногие сейчас знают о таком виде икон. Речь идёт о православной иконе “Иоанн Воин”.

Святой Иоанн является защитником скорбящих, обиженных, защищает от воровства, помогает найти вора и вернуть пропажу владельцу, покровительствует военным и всем тем, кто идёт на битву в защиту Отечества. С молитвами к Иоанну Воину обращаются и те, кто находится в заточении или в плену, в печали, обиде и невзгодах.



*Абраз “Иоанн Воин” з фондаў ДУ ГКМЗ “Заслаўе”*

Иоанн Воин служил в войсках римского императора Юлиана Отступника. По приказу Юлиана он должен был преследовать христиан, убивать их, но Иоанн не выполнял этот его приказ, а предупреждал христиан об опасности, освобождал тех из них, кто был в заточении, помогал бежать. Он был милосердным как к верующим христианам, так и ко всем страждущим, которые нуждалась в помощи, утешении в скорби. Как только император узнал о настоящих делах Иоанна Воина, он приказал бросить его в темницу. Позднее Юлиан Отступник был убит, а Иоанн Воин был выпущен на свободу. Жил он в святости, вёл служение на благо ближних, до самой своей кончины в почтенной старости. За это служение Иоанн был причислен к лику Святых. Мощи Святого Иоанна Воина, которые по воле Божьей были наделены благодатной силой исцеления, много веков назад были перенесены в храм апостола Иоанна Богослова.

Обычно Святой Иоанн изображался на иконах с непокрытой головой в воинском облачении. Сам он темноволосый, лик его обрамлён тёмной бородой. В правой руке Святого нередко встречался крест. На ряде изображений с Иоанном присутствовали копьё, меч или щит. Копьё и меч – знаки силы, воинского начала, щит – защита от врагов и напастей.

На иконе с Иоанном Воином, хранящейся в фондах музея-заповедника, присутствует поясное изображение Святого. В правой его руке – крест, а в левой – копьё, красная хоругвь с жёлтым крестом. Одет Святой в чешуйчатые доспехи, поверх которого он облачён в красный плащ, на голове его – жёлтая с орнаментом барочной формы митра. Святой изображён на коричневом фоне с жёлтым декоративным растительным орнаментом (олицетворение Рая), слева от его нимба – большой бирюзовый цветок. Эта богатая узорчатость и орнаментика вместе

с жизнеутверждающими цветами и содержанием в сочетании со строгостью канона, а также светлая палитра лика святого, говорят о том, что икона является произведением белорусской школы живописи.

Отмечен случай, когда одна из древних икон, на которой был написан Иоанн Воитель, являла чудеса. В 1382 г., во время нашествия татар на Русь, отряд татар ворвался в Серпуховской Владычный женский монастырь, где находилась чудотворная икона Святого Иоанна Воина. Один из татар решил поглумиться над иконой, начал её пилить. В местах распила показалась кровь, но богохульник всё равно продолжил её пилить ещё в двух местах. Вдруг места распила сами собой соединились, и татарин, который пришёл в себя после приступа гнева, бросил это своё глумление и в трепете обратился ко Христу. Затем этой чудотворной иконе сделали особую ризу – так, чтобы были видны следы запёкшейся крови. С той поры 12 августа (по старому стилю – 30 июля) в обители особым образом празднуется поминовение Иоанна Воина – совершается всенощное бдение и праздничная литургия.

В истории известен факт особого почитания Иоанна Воина царём и впоследствии императором Российской империи Петром I: он всюду возил с собой икону Святого Иоанна Воина во время всей военной компании против шведов, считая его своим святым покровителем, способствовавшим успеху в победе над врагом, ратных подвигах на поле битвы.

*Ирина Артемьева,*
*ст. н. с. отдела фондов*

*Литература*

1. Икона святого мученика Иоанна Воина [электронный ресурс] – Интернет-проект “Православные Святыни”. – Режим доступа: https://svjatyni.ru/ikony/ikona-svyatogo-muchenika-ioanna-voina.html. – Дата доступа: 9.02.2022.
2. Святой Иоанн Воин: акафист, икона, в чем помогает [электронный ресурс] – Информационный сайт про иконы, молитвы, православные традиции. – Режим доступа: https://ikona-i-molitva.info/svyatoj-ioann-voin-akafist-ikona-v-chem-pomogaet/. – Дата доступа: 11.02.2022.

**Выданне не з'яўляецца камерцыйным:** распаўсюджваецца дармова (бясплатна) і выключна ў адукацыйных і асветніцкіх мэтах для знаёмства з працай і здабыткамі ДУ «ГКМЗ «Заслаўе».

**Газета «Заслаўскія Зборы» існуе толькі ў электронным выглядзе**, з мэтай рэалізацыі шырокага доступу да яе матэрыялаў праз сетку «Інтэрнэт», а таксама – ашчаднага стаўлення да прыродных рэсурсаў.

**Рэдкалегія: Сабалеўская І.В., Арцемьева І.Д., Пакінка А.В., Кандратовіч І.Г.**

**Рэгулярнасць:** газета выдаецца раз на месяц.